## ПА ПРАГРАМЕ ЎЗГОДНЕНЫХ ДЗЕЯННЯЎ

**У адносінах краін — удзельніц Саюзнай дзяржавы няма асаблівых праблем ні на самым высокім узроўні, ні на ўзроўні МЗС**

Аб гэтым заявіў Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка на сустрэчы з міністрам замежных спраў Расіі Сяргеем Лаўровым, паведамляе прэс-служба кіраўніка дзяржавы.

Прэзідэнт адзначыў, што паспяхова рэалізуецца двухбаковая праграма ўзгодненых дзеянняў у галіне знешняй палітыкі дзяржаў — удзельніц дагавора аб Саюзнай дзяржаве, разлічаная на 2014–2015 гады, мерапрыемствы якой выконваюцца дакладна і своечасова. «Упэўнены, што яна будзе рэалізавана так, як павінна быць у адносінах нашых брацкіх дзяржаў. Тыя праблемы, якія існуюць, мы вырашаем у нармальным рэжыме», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

«Думаю, трэба ў бліжэйшы час, як складуцца абставіны, можа, у пачатку восені, звярнуцца да пытанняў нашых адносін у фармаце Саюзнай дзяржавы. Думаю, як мінімум урады павінны сабрацца і правесці сумесны Саўмін, каб адрэгуляваць некаторыя праблемы, асабліва ў сувязі з дзейнасцю Еўразійскага эканамічнага саюза, — адзначыў Прэзідэнт. — Гэтая размова двух урадаў дасць сігнал і трэцяму боку для таго, каб на такім жа ўзроўні пагледзелі на некаторыя праблемы, якія, магчыма, паўстануць да пачатку восені ў сувязі з функцыянаваннем новага эканамічнага саюза».

Аляксандр Лукашэнка лічыць візіт кіраўніка расійскага МЗС своечасовым. «У сувязі з многімі праблемамі, якія склаліся вакол нас, — гэта своечасовая сустрэча, і нам важна зверыць гадзіннікі», — сказаў Прэзідэнт.

## ПОЎНАЕ СУПАДЗЕННЕ ПА ЎСІХ ПЫТАННЯХ

**Учора ў Мінску завяршыліся перамовы кіраўнікоў дыпламатычных ведамстваў Беларусі і Расіі. Уладзімір МАКЕЙ і Сяргей ЛАЎРОЎ абмеркавалі двухбаковыя стасункі краін, супрацоўніцтва ў міжнародных арганізацыях, не абышлі ўвагай і сітуацыю ў суседняй Украіне.**

Па выніках перамоў Уладзімір Макей заявіў журналістам, што краіны пацвердзілі поўнае супадзенне пазіцый па ўсіх пытаннях двухбаковай павесткі дня і супрацоўніцтва ў міжнародных арганізацыях. Кіраўнік МЗС Беларусі паведаміў, што асобна разглядалася каардынацыя дзеянняў Беларусі і Расіі ў ААН. «Мы разгледзелі шэраг аспектаў каардынацыі нашай працы ва ўстановах сістэмы ААН, уключаючы сумеснае прасоўванне знешнепалітычных ініцыятыў на розных міжнародных пляцоўках», — расказаў Уладзімір Макей.

Таксама ён заўважыў, што пры разглядзе пытанняў аб узаемадзеянні Беларусі і Расіі ў міжнародных рэгіянальных арганізацыях асаблівая ўвага была нададзена далейшым сумесным намаганням па ператварэнні АБСЕ ў паўнавартасную міжнародную арганізацыю, якая на справе спрыяла б развіццю супрацоўніцтва і ўмацаванню бяспекі на еўраатлантычнай прасторы.

У сваю чаргу, Сяргей Лаўроў паведаміў, што прыярытэтнае значэнне на перамовах мела знешнепалітычнае суправаджэнне працэсаў еўразійскай інтэграцыі з улікам падпісанага дагавора аб Еўразійскім эканамічным саюзе. Ён падкрэсліў значнасць самога факта падпісання Дагавора аб стварэнні ЕАЭС. «Шматбаковыя дамоўленасці — гэта заўсёды пакет кампрамісаў. Так было і на гэты раз. На гэтым жыццё не заканчваецца. ЕАЭС будзе пашырацца, развівацца, разрастацца. У бліжэйшы час чакаецца афіцыйнае далучэнне Арменіі, пасля аналагічны крок будзе зроблены Кыргызстанам», — сказаў міністр замежных спраў Расійскай Федэрацыі. Ён адзначыў, што еўразійскі інтэграцыйны працэс з'яўляецца адкрытым для супрацоўніцтва з іншымі аб'яднаннямі, уключаючы Еўрапейскі саюз. «У нашых агульных інтарэсах працаваць над гарманізацыяй інтэграцыйных працэсаў у розных частках Еўразіі, у тым ліку маючы на ўвазе мэту паступовага, але ўстойлівага фарміравання адзінай эканамічнай і гуманітарнай прасторы ад Атлантыкі да Ціхага акіяна», — лічыць Сяргей Лаўроў.

Што да сітуацыі ва Украіне, то кіраўнік расійскага знешнепалітычнага ведамства паведаміў, што гэтаму пытанню таксама была нададзена ўвага. «Брацкі ўкраінскі народ перажывае трагічны перыяд. Мы зацікаўлены ў тым, каб як мага хутчэй спыніць кровапраліцце, пачаць узаемапаважлівы, агульнанацыянальны дыялог з удзелам і ўлікам інтарэсаў усіх рэгіёнаў краіны, як гэта прадугледжана ў Жэнеўскай заяве ад 17 красавіка і распрацаванай на яго аснове дарожнай карце швейцарскага старшынства ў АБСЕ», — заявіў Сяргей Лаўроў.

Адказваючы на пытанне журналістаў наконт нападзення на расійскае пасольства ў Кіеве, міністр замежных спраў нашай краіны падкрэсліў, што падобныя правакацыйныя дзеянні заслугоўваюць асуджэння. «Украіна прыняла на сябе абавязкі па забеспячэнні бяспекі ўсіх дыпламатычных устаноў, у тым ліку расійскай, у адпаведнасці з Венскай канвенцыяй. І гэтыя абавязкі павінны выконвацца», — адзначыў Уладзімір Макей.

Нагадаем, што ў суботу каля будынка пасольства Расіі ў Кіеве пачаўся пікет, які выліўся праз некалькі гадзін у беспарадкі. У будынак паляцелі выбуховыя пакеты, камяні, з флагштока сарвалі расійскі сцяг. Пратэстуючыя размалявалі агароджу свастыкамі, перавярнулі прыпаркаваныя каля пасольства аўтамабілі. Па даных СМІ, натоўп не сустрэў супраціўлення з боку праваахоўных органаў.

**Надзея ЮШКЕВІЧ.**

■ АПК: праблемы і рашэнні

# ГАСПАДАРКАМ ТРЭБА БОЛЬШ САМАСТОЙНАСЦІ

**Сваім меркаваннем з нагоды развіцця АПК падзяліўся Васіль ЮХІМУК, старшыня СВК «Дарапеевічы» Маларыцкага раёна:**

— Найперш трэба навесці парадак у сістэме кіравання сельгаспрадпрыемствамі. Сёння вельмі шмат інстанцый, якія прымаюць рашэнні па гаспадарчай дзейнасці любога СВК або ААТ, а калі што пайшло не так — адказваць, па сутнасці, няма каму. Апошнім застаецца калгас, які цяпер называецца па-іншаму. Працую шмат гадоў, сітуацыю назіраю не толькі ў сваім раёне, яна ўсюды прыкладна аднолькавая. Праводзяцца рэарганізацыі, гаспадаркі далучаюць адну да адной, але названы працэс ініцыюецца зверху, а не ідзе знізу. На жаль, часта нічога з такіх перастановак не атрымліваецца. Самае большае, што могуць потым — зняць з пасады кіраўніка, які не справіўся. А знайсці прычыны, выкараніць іх, каб не дапусціць падобных пралікаў у будучыні, рукі не даходзяць альбо жадання няма наогул. Залішняя ж апека часта толькі шкодзіць справе.

Цяпер нярэдка гавораць пра непад'ёмныя для АПК крэдыты. Сапраўды, пазыку пад 40 працэнтаў, відаць, мала дзе ў свеце могуць дазволіць сабе сельгасвытворцы. Але і такі крэдыт атрымаць, аказваецца, бывае няпроста, а часам і немагчыма. Што трэба для атрымання крэдыту? Нават старшакласнік сёння адкажа, што варта ісці ў банк з бізнес-планам і дакументамі, якія даказваюць тваю плацежаздольнасць. Так мы і зрабілі, калі трэба было правесці рэканструкцыю старых жывёлагадоўчых памяшканняў. Там паперы паглядзелі, сказалі, што яны ў парадку… Але крэдыту не далі.

Аказалася, што крэдытамі распараджаецца не банк, а раённая выканаўчая ўлада. І нашы шаноўныя чыноўнікі вырашылі, што на тым этапе крэдыты больш патрэбны іншым гаспадаркам. Ім і далі. Што атрымалася ў выніку? Яны пабудавалі свае жывёлагадоўчыя памяшканні, а запаўняць іх няма чым. У нас на сто гектараў сельгасугоддзяў — 100 кароў у гаспадарцы, у суседзяў — прыкладна 50. Логіка падказвае, што будаваць у першую чаргу трэба было нам. Але тая самая логіка падвяла нейкую адказную асобу, а банк аказаўся нязлобным прыняць рашэнне. У выніку прайгралі ўсе. Асабліва крыўдна за гэта было на апошняй абласной нарадзе, калі агучылі адну лічбу: у Пружанскім раёне патрэбна запоўніць дзве тысячы месцаў буйной рагатай жывёлай. Там набудавалі фермаў, цяпер думаюць, як іх запоўніць. У нас жывёла ёсць, яе няма куды ставіць. А гэта пралікі ў кіраванні. Думаю, няцяжка здагадацца, што ахвотных за іх адказаць не знойдзецца.



Фота Валерыя КАРАЛЯ.

Яшчэ адна загана нашай рэчаіснасці — пагоня за лічбамі. Вось і нядаўна ў зводках здарэнняў непрыемна закранула навіна: да адказнасці прыцягнуты раённыя чыноўнік за прыпіскі ў аграрнай галіне. Хіба ён адзін такі, каму хацелася выглядаць не горш за іншых? Навошта ў нас надаецца павышаная ўвага лічбам, наогул не разумею. Ацэньваць работу трэба па канчатковым выніку, па агульным узроўні эфектыўнасці, а не гнацца за нейкімі бягучымі паказчыкамі. І зноў жа да пытання пра самастойнасць. Часам больш эфектыўна бывае атрымліваць 40 цэнтнераў з гектара, а не гнацца за прывабнымі ў зводках 60. Тое ж самае і ў жывёлагадоўлі: можна даіць ад каровы 6000 кілаграмаў малака і мець больш эканамічны эфект, чым атрымліваць 8000 і несці выдаткі, якія значна паніжаюць агульную эфектыўнасць. Усё гэта павінна вырашаць сама гаспадарка. На тое там кіраўнікі і спецыялісты.

**Святлана ЯСКЕВІЧ**

■ Меркаванне



# ХТО РАСПЛАЧВАЕЦЦА ЗА АВАНТУРЫ?

**Апошнія паўтара дзясятка гадоў Захад прыкметна актывізаваўся на геапалітычнай арэне з місіяй прасоўвання дэмакратыі з дапамогай войнаў і «каляровых» рэвалюцый. Разгледзім, да чаго гэта прыводзіць.**

**Першай ахвярай «каляровай» рэвалюцыі стала Сербія. За мінулы час ад яе аддзялілася Чарнагорыя, пазбавіўшы краіну выхаду да сусветнага акіяна, і было адарвана Косава. Агульная эканамічная сітуацыя вымушае жадаць лепшага, у тым ліку з-за сербаў-бежанцаў з Косава.**

Наступнай краінай, якая патрапіла пад удар ЗША, стаў Афганістан. Пасля шматгадовай акупацыі ЗША пачалі выводзіць войскі, абвясціўшы, што краіна перайшла да дэмакратыі. І сапраўды, менавіта цяпер прайшоў другі тур прэзідэнцкіх выбараў. Толькі з выказваннем сваёй пазіцыі ў выбаршчыкаў былі праблемы: падчас галасавання адбылося 150 тэрактаў, 46 чалавек загінула, а больш за 7 мільёнаў чалавек адмовіліся галасаваць з-за пагрозы іх жыццю. Калі такое адбываецца пры знаходжанні заходніх войскаў у краіне, то страшна ўявіць, што пачнецца, калі новы ўрад застанецца з талібамі сам-насам.

Наступнай мэтай аперацыі па насаджэнні дэмакратыі стаў Ірак. Амерыканцы заявілі, што не могуць дамовіцца з Садамам Хусэйнам (тым самым Садамам, якога забяспечвалі хімічнай зброяй падчас распачатай па іх прымусу вайны з Іранам) і ваенная атака проста неабходная. Як і на Афганістан, на ваенную авантуру было затрачана ад паўтара да двух трыльёнаў долараў. Як і ў Афганістане, тэракты сталі паўсядзённай рэчаіснасцю жыцця краіны. Багаты на нафту Курдыстан фактычна аддзяліўся ад Ірака, што выклікае сур'ёзныя апасенні ў краін-суседзяў, у якіх ёсць таксама вялікая колькасць курдаў. А з пачатку чэрвеня баевікі «Ісламскай дзяржавы Ірака і Леванта», структуры, шчыльна звязанай з Аль-Каідай, і зусім перайшлі ў наступленне на ўрадавыя войскі.

Тое, што адбываецца ў выніку, невераготна: урадавае войска, на навучанне і забеспячэнне якога амерыканцы, па іх звестках, выдаткавалі дзясяткі мільярдаў долараў, імкліва адыходзіць, кідаючы навенькае ўзбраенне на полі бою. Масул і Тыкрыт захоплены, войскі паўстанцаў імкнуцца да Багдада. Амерыканцы адмаўляюцца ўводзіць войскі для дапамогі сяброўскаму ўраду з празаічнай нагоды — адсутнасці сродкаў у бюджэце на чарговую авантуру. Адзінай жа краінай, якая аказвае ваенную дапамогу іракскаму ўраду, стаў той самы Іран, які заходнія краіны дэманізуюць ужо чацвёртае дзесяцігоддзе.

Пасля пачатку шакіруючых падзей у Іраку міністр замежных спраў Расіі Сяргей Лаўроў адзначыў: «Гэта ілюстрацыя поўнага правалу авантуры, якую задумалі перш за ўсё ЗША і Вялікабрытанія і якую яны выпусцілі з-пад кантролю канчаткова».

> **Расплачваюцца за авантуры Захаду перш за ўсё жыхары краін, якія сталі аб'ектам эксперыментаў заходніх дзяржаў па ваенным умяшанні і «каляровых» рэвалюцыях «з мэтай пераходу да дэмакратыі».**

Наступнай краінай для заходніх эксперыментаў у 2003 годзе стала Грузія. Да ўлады ў выніку «каляровай» рэвалюцыі 2003 прыйшоў Міхаіл Саакашвілі. У 2012 годзе парламент, у якім прыйшлі да ўлады яго праціўнікі, афіцыйна абвясціў аб наяўнасці ў Грузіі 180 палітвязняў. На хвалі гэтых паведамленняў і жудасных відэазапісаў з грузінскай турмы, дзе зняволеныя падвяргаліся сексуальнаму гвалту з боку наглядчыкаў, пераемнік Саакашвілі прайграў на выбарах апазіцыі і Грузія змяніла свой курс. Адным з вынікаў праамерыканскай улады стала таксама канчатковая страта Абхазіі і Паўднёвай Асеціі пасля распачатай у 2008 годзе авантуры па іх вяртанні пры дапамозе ваенных сродкаў.

Наступнай краінай, дзе змаглі пад кіраўніцтвам Захаду правесці паспяховую «каляровую» рэвалюцыю, стала ў 2004 годзе Украіна. Вынікі мы з жахам назіраем і сёння: у лютым адбылася ўжо другая «каляровая» рэвалюцыя, непасрэдным вынікам якой стала адразу больш за сотню ахвяр і страта Крыма, а Украіна перайшла ў стан грамадзянскай вайны, з якой невядома калі выйдзе.

Калі па выніках гэтага года ўкраінская эканоміка ўпадзе толькі на пяць працэнтаў, гэта ўжо будзе вялікім поспехам. Для тых, хто не стане чарговай ахвярай з сотняў грамадзян краіны, якія ўжо загінулі ў выніку ваеннага супрацьстаяння.

У 2011 годзе ў выніку «дэмакратычных арабскіх рэвалюцый» да працэсу перабудовы па заходніх мерках прыступілі яшчэ некалькі краін. Для Егіпта гэты працэс ужо скончыўся: вайскоўцы, якія стаміліся ад хаосу, захапілі ўладу і зноў паставілі на чале краіны свайго прадстаўніка. У Лівіі сітуацыя катастрафічная: краіна фактычна распадаецца на ўдзельныя княствы, уладныя структуры паралізаваныя, ад рэзка ўпаў узровень жыцця насельніцтву застаецца толькі марыць. Жыхары ж Сірыі заплацілі ўжо велізарную цану за супраціў заходнім планам прывесці да ўлады падкантрольны амерыканцам урад і, поўныя рашучасці, супраціўляюцца і далей.

Хто расплачваецца за авантуры Захаду, досыць відавочна. Перш за ўсё, гэта жыхары саміх краін, якія сталі аб'ектам эксперыментаў заходніх дзяржаў па ваенным умяшанні і «каляровых» рэвалюцыях «з мэтай пераходу да дэмакратыі». Іх жыццёвыя перспектывы зніжаюцца, яны гінуць у выніку сутыкненняў з барацьбітамі за ўладу або з тымі, хто прэтэндуе на сепаратны выхад з дагэтуль адзінай краіны, пакутуюць ад тэрактаў, часта вымушаны пакідаць сваю радзіму і жыць у галечы на чужыне.

**Сяргей КІЗІМА, доктар палітычных навук**